**Варонік С.А. (Брэст)**

## «Стваральнік і вартаўнік духоўнай скарбніцы беларускага адраджэння»: Уладзімір Калеснік пра Максіма Багдановіча

У гісторыі беларускай культуры ёсць асобы, над творчай спадчынай якіх не мае ўлады час: яна з'яўляецца актуальнай, хоць і аддалена ад сённяшняга дня вялікім прамежкам часу. Падобным феноменам з'яўляюцца паэзія, публіцыстыка М. Багдановіча. Як зазначыў А. Лойка, «ён – адзіны, які чытаецца ўсімі адзіна. Гэта не значыць, што ён адназначны: вобраз у мастацтве заўсёды шырэй таго, чым ён ёсць для яго ўспрымальніка ў гэтым месцы і ў гэтую хвіліну. Таму і Багдановіч з часам будзе чытацца па-рознаму, яшчэ ўзнікнуць розныя канцэпцыі яго жыцця і творчасці, новыя метады і сродкі даследавання ў ім адкрыюць нешта па-новаму. Але гаворка тут менавіта аб тым, што для ўсіх нас, хто сёння ведае, любіць і вывучае Максіма Багдановіча, ён цэласны: даецца, чытаецца ўсімі адзіна. Гэта – ад строгай класічнай завершанасці яго мастацкага слова, ад акрэсленасці, ад набліжэння да ідэальнага і агульначалавечага цераз форму найбольш універсальную, ад таго, што Багдановіч – наш сучаснік, бо як паэт ён апярэджваў час, і вось крочыць поруч з кожным з нас, як наш» [3, с. 43].

Паказальнымі з'яўляюцца артыкулы У. Калесніка «Багдановічава калакагатыя» і «“Апокрыф” М. Багдановіча». У пачатку першага з іх аўтар тлумачыць значэнне тэрміна, які ўключаны ў загаловак: «У старажытных грэкаў ён азначаў гарманічную спалучанасць у асобе чалавека высакароднасці і красы; нам будзе больш зразумелы сінтэз дабра і красы, маральнага і прыгожага» [2, с. 7]. Літаратуразнавец даследуе асаблівасці асэнсавання маральнага і прыгожага асветнікамі, мастакамі, аскетамі і святымі айцамі. «Еўрапейскае Адраджэнне супрацьставіла абсалюту красы занябеснай ідэю многасці красы, разнастайнасці яе праяў: прыгожымі абʼяўляліся малюнкі прыроды, архітэктурныя збудаванні, чалавечае цела, а не толькі дух. Феноменам хараства, адкрытым мастакамі Адраджэння, была Богамаці – Мадонна» [2, с. 7]. На яго думку, менавіта «феномен красы Мадонны быў успрыняты і вынесены М. Багдановічам на алтар беларускага Адраджэння» [2, с. 7].

На думку даследчыка, ідэал калакагатыі ствараецца ў перыяд абнаўлення грамадства, калі «ўся сістэма каштоўнасцей знаходзіцца ў руху». М. Багдановіча У. Калеснік бачыць як *першапраходцу і творцу алтара з перлаў і дыяментаў духоўных каштоўнасцей народа,* як *стваральніка і вартаўніка духоўнай скарбніцы беларускага Адраджэння.* У асэнсаванні дзеянняў Усяслава Чарадзея, Ізяслава Полацкага, Францыска Скарыны, безыменных летапісцаў, перапісчыкаў, іншых стваральнікаў духоўных скарбаў беларускага народа, а таксама ў «гордым птаху» Страцім-лебедзі У. Калеснік бачыць М. Багдановіча як гуманіста, які «не траціў веры ў чалавека, давяраў яго здольнасці выхоўваць сябе, удасканальвацца, знаходзіць шчасце не ў сытасці і асабістым дабрабыце, а ў ахвярным слугаванні радзіме і народу, у спачуванні і дапамозе слабейшым. Больш за сябе пакрыўджаным» [2, с. 10]. Даследчык адзначае пазіцыю М. Багдановіча ў дыскусіі пра беларускую літаратуру. І сёння не страцілі актуальнасці словы Максіма Кніжніка, што «беларускае пісьменства павінна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

быць беларускім па духу, па складзе і еўрапейскім ці сусветным па мастацкім узроўні» [2, с. 10].

У артыкуле «“Апокрыф” М. Багдановіча» У. Калеснік акрэслівае асаблівасці асэнсавання прыгожага і карыснага ў мастацкіх плынях розных эпох, паказвае Багдановічава разуменне сумяшчальнасці *красы і карысці, мастацтва і працы.* «Краса і мастацтва, паводле Багдановічавага Хрыста, прысутнічаюць усюды, дзе толькі цепліцца жыццё, у самых высокіх і ў самых будзённых «нізкіх» сферах, напрыклад, на жніве песня здымае стому цяжкай працы, на хаўтурах – спаталяе збалелыя душы, дапамагае адолець трагічнае патрасенне. Патрэба ў красе – натуральная і ўсеагульная патрэба жыцця і душы народнай, краса – пажытак для душы» [1, с. 13]. У. Калеснік адзначае «эстэтычны фон і рэха» «Апокрыфа» М. Багдановіча ў творах яго сучаснікаў і наступнікаў.

Прачытанне У. Калеснікам твораў М. Багдановіча сведчыць пра тое, што сапраўды *паэт нараджаецца не аднойчы:* філасофія і краса яго паэтычнага слова мае водгук у чуйных да роднага слова душах.

**Літаратура**


1. Калеснік, У. «Апокрыф» М. Багдановіча / У. Калеснік // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – 1999. – № 5. – С. 11–14.
2. Калеснік, У. Багдановічава калакагатыя / У. Калеснік // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – 1999. – № 5. – С. 7–11.
3. Лойка, А. Паэт нараджаецца не аднойчы / Багдановіч, М. // Поўны збор твораў : у 3 т. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. –1992.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ